УДК 94(476)"16":316.343-058.12

# Род мяшчан Адамовічаў у Гародні ў XVII ст.

**Сліж Н.У.**
*Гродзенская рэгіянальная газета "Перспектыва", Гродна*

*Гісторыя мяшчанскіх родаў мае важнае значэнне ў вывучэнні гісторыі гарадоў. Гэта робіць гісторыю персаніфікаванай і паказвае, як падзеі адлюстроўваліся на жыцці людзей. Род мяшчан Адамовічаў займаў важныя пазіцыі ў Гародні ў XVII ст., аднак у гістарыяграфіі яму не было нададзенай адпаведнай увагі.*

*Мэта даследавання – прааналізаваць гісторыю гарадзенскага мяшчанскага роду Адамовічаў і паказаць яго ўплыў на сістэму кіравання ў магістраце, а таксама звярнуць увагу на прыватнае жыццё мяшчанства.*

***Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі сталі прыватна-прававыя дакументы, якія захоўваюцца ў гарадзенскіх магістрацкіх кнігах. Але абмежаванасць магістрацкіх кніг і знішчэнне прыватных архіваў не дае ў поўнай меры прадставіць поўную карціну па гісторыі роду. Не заўсёды ёсць магчымасць дакладна ідэнтыфікаваць, з якой сям'і паходзіла асоба. У мяшчанскіх дакументах рэдка згадвалася імя па-бацьку. Гэта сітуацыя закранае і гарадзенскі род Адамовічаў, які прадстаўлены ў дадзенай працы. Асноўнымі метадамі даследавання сталі метад аналізу, параўнаўчы метад і храналагічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Вывучэнне мяшчанскіх родаў мае важнае значэнне для гісторыі любога горада. Гэта дае магчымасць зразумець не толькі сістэму кіравання, але і як у яе ўваходзілі. Акрамя таго, падобныя гістарычныя прыклады ўзбагачаюць гісторыю не толькі канкрэтнага горада, але і даюць матэрыял для параўнання з іншымі мясцовасцямі. Прыклад роду Адамовічаў, як і прыклад іншых родаў, паказвае, як фарміравалася эліта Гародні, як пасады пераходзілі з пакалення ў пакаленне. У беларускай гістарыяграфіі роду Адамовічаў не прысвячалася асобных даследаванняў.*

***Заключэнне.** Гісторыя сямей Войцеха і Яна Адамовічаў прадстаўляе цікавы фрагмент з жыцця гарадскіх эліт. Маёмасны стан і сацыяльны статус яго прадстаўнікоў дазвалялі мець шлюбныя адносіны з асобамі з дробнай шляхты і з дзецьмі ўраднікаў, займаць пасады ў магістраце. Выпадак бурмістра Яна Адамовіча паказвае, што справаздачу ўраднікі не рабілі своечасова і гэта абавязак пераходзіў на сваякоў. Яго дзеці пайшлі па яго слядах. Аднак свае абавязкі як ураднікі выконвалі па-рознаму, нават з парушэннямі. З прыватна-прававых дакументаў атрымліваем інфармацыю аб маёмасным стане сям'і, аперацыі па куплі-продажы і падзеле маёмасці. У выніку дакументы даюць уяўленне пра грамадскае і прыватнае жыццё прадстаўнікоў роду Адамовічаў.*

***Ключавыя словы:** мяшчане, эліта, Адамовічы, Вялікае Княства Літоўскае, Гародня.*

*(Ученые записки. – 2022. – Том 36. – С. 20–26)*

# The burger kin of the Adamoviches in Grodno in the 17th century

**Slizh N.U.**
*Grodno Region Newspaper "The Perspective", Grodno*

*The history of burgher families is important in the study of the history of cities. It makes the stories personalized and shows how events influenced people's lives. The burgher kin of the Adamoviches played an important role in Grodno in the seventeenth century but historiography did not pay proper attention to it.*

*The research purpose is to analyse the history of Grodno burgher kin of the Adamoviches and to show its influence on the system of management at the magistrate as well as to draw attention to the burger private life.*

***Material and methods.** The main sources were private documents stored in Grodno magistrate books. However, the limited number of magistrate books and the destruction of private archives does not allow to fully present a complete picture of the history of the family. It is not always possible to identify exactly the origin of a person. Middle names were rarely mentioned in burgher documents. This also concerned the burgher kin of the Adamoviches, presented in this work. The main research methods were the method of analysis, the comparative and the chronological methods.*

***Finding and their discussions.** Studying burgher elites is important for any city. This gives an opportunity to understand not only the management system, but also how it was organized. In addition, similar historical examples enrich the history of not only a certain city, but also provide material for comparison with other localities. The example of the Adamoviches family, as well as the example of other families, shows how the elite of Grodno was formed, how positions were passed from generation to generation. The Adamoviches family has not been studied yet in Belarusian historiography.*

***Conclusion.** The story of the Voitsech and Jan Adamovich presents an interesting fragment from the life of the city elites. The wealth and social status of its representatives allowed them to have marital relations with persons from gentry and with the children of government officials, to hold positions in the magistrates' office. The case of Jan Adamovich shows that the government officials did not make reports on time and this duty was transferred to relatives. His children were also officials in Grodno. However,*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: magistra-v@mail.ru*** *– Н.У. Сліж*

*they performed their duties in different ways, even with violations of the law. Information about the property status of the family, transactions on purchase and sale and division of property follows from private legal documents. As a result, the documents provide insight into the public and private life of the representatives of Adamovich family.*

***Key words:*** *burghers, elite, the Adamoviches, the Grand Duchy of Lithuania, Grodno.*

*(Scientific notes. – 2022. – Vol. 36. – P. 20–26)*

Гісторыя мяшчанскіх родаў мае важнае значэнне ў вывучэнні гісторыі гарадоў. Гэта робіць гісторыю персаніфікаванай і паказвае, як падзеі адлюстроўваліся на жыцці людзей. У сваіх даследаваннях мы звярталі ўвагу на гісторыю мяшчанскіх родаў, іх паходжанне [1; 2]. Род Адамовічаў займаў важныя пазіцыі ў Гародні ў XVII ст., аднак у гістарыяграфіі яму не было нададзенай адпаведнай увагі.

Мэта даследавання – прааналізаваць гісторыю гарадзенскага мяшчанскага роду Адамовічаў і паказаць яго ўплыў на сістэму кіравання ў магістраце, а таксама звярнуць увагу на прыватнае жыццё мяшчанства.

**Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі сталі прыватна-прававыя дакументы, якія захоўваюцца ў гарадзенскіх магістрацкіх кнігах. Але абмежаванасць магістрацкіх кніг і знішчэнне прыватных архіваў не дае ў поўнай меры прадставіць поўную карціну па гісторыі роду. Не заўсёды ёсць магчымасць дакладна ідэнтыфікаваць, з якой сям'і паходзіла асоба. У мяшчанскіх дакументах рэдка згадвалася імя па-бацьку. Гэта сітуацыя закранае і гарадзенскі род Адамовічаў, які прадстаўлены ў дадзенай працы. Асноўнымі метадамі даследавання сталі метад аналізу, параўнаўчы метад і храналагічны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вывучэнне мяшчанскіх родаў мае важнае значэнне для гісторыі любога горада. Гэта дае магчымасць зразумець не толькі сістэму кіравання, але і як у яе ўваходзілі мяшчане. Акрамя таго, падобныя гістарычныя прыклады ўзбагачаюць гісторыю не толькі канкрэтнага горада, але і даюць матэрыял для параўнання з іншымі мясцовасцямі. Прыклад роду Адамовічаў, як і прыклад іншых родаў, паказвае, як фарміравалася эліта Гародні, як пасады пераходзілі з пакалення ў пакаленне. У беларускай гістарыяграфіі роду Адамовічаў не прысвячалася асобных даследаванняў.

***Першыя згадкі пра Адамовічаў.*** Пра паходжанне роду Адамовічаў дастаткова цяжка казаць, бо большасць дакументаў па гісторыі роду захаваліся з XVII ст. Асноўнае месца пражывання роду была вёска Адамавічы, якая існуе і цяпер недалёка ад Гродна. Даволі вялікая верагоднасць, што назва вёскі была звязана з гэтым мяшчанскім родам. Населены пункт падпарадкоўваўся магдэбургскаму праву, бо вёска, як шэраг іншых, уваходзіла ў склад гарадзенскай магдэбургіі і лічылася гарадской. Паводле валочнай памеры 1561 г. тут налічвалася 30 валок. Мелі там уладанні Станіслаў Адамовіч (7 валок), Міско Адамовіч (8 валок), Павел Нарковіч (5 валок). Ярмак, Міско, Янко Панасовіча (1 валока), Багдан Наўмавіч (3 валокі), Андрэй Квач (6 валок) [3, с. 77–78].

Верагодна, у Станіслава Адамовіча, які згадваецца ў памеры валочнай, былі дзеці Андрэй і Кацярына. Андрэй быў жанаты з Марынай Заліпшчанкай, валодаў зямлёй у Адамавічах, пасля прадаў Марціну Адамовічу. На 1640 г. яго сястра памерла. Супраць яго падалі скаргу Войцех Хрыбуцэнята[1] і Рэгіна Хрыбуцянка, прэтэндуючы спадчыну Кацярыны [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 133 – 133адв., 188адв.–190].

З прадстаўнікоў роду Адамовічаў на пасадах згадваюцца наступныя асобы: радца Мікалай Адамовіч (1593) [4, КМФ-18, спр. 77, арк. 508адв., 511адв.], Грыгорый Адамовіч (1599) [3, КМФ-18, спр. 86, арк. 238], бурмістр Стэфан Адамовіч (1609) [5, L. 1]. Сваю кар'еру яны рабілі ў другой палове XVI ст., але калі і як яны яе пачыналі, цяжка сказаць без магістрацкіх кніг. Далей мы прадставім гісторыю дзвюх сямей – Войцеха і Яна Адамовічаў.

***Сям'я Войцеха Адамовіча.*** Войцех Адамовіч быў жанаты тры разы: з Барбарай Талочкаўнай, Агнешкай Тумілоўнай і Ганнай Катовічаўнай. Першая жонка Б. Талочкаўна паходзіла са шляхецкага роду, які пражываў у Гарадзенскім павеце. Пра агульную колькасць дзяцей Войцеха сказаць цяжка. У дакументах згадваюцца: Марцін, Юзаф, Адам, Люцыя (жонка Лукаша Скрабяцкевіча), Альжбета (жонка Тамаша Дмухоўскага). Люцыя была народжана ў шлюбе з Барбарай Талочкаўнай, а Марцін, Юзаф і Адам былі народжаны з Агнешкай Тумілоўнай. Былі яшчэ дзве дачкі: адна была замужам за Янам Маляром, а другая – за Андрэем Рыбаком.

У 1638 г. Войцех памёр. Была праведзена інвентарызацыя яго маёмасці 31 мая [дадатак 1]. Яе праводзіў лаўнік Ян Адамовіч. Валоку зямлі ў Адамавічах падзялілі пазней. Пры апісанні маёмасці былі Марцін, як старэйшы сын, і ўдава Ганна Катовічаўна, а таксама тры зяці. Як вынікае з дакументаў, іншыя браты на той час былі непаўналетнія. Планіроўка дома складалася з чорнай "ізбы" з сянямі, а перад ёй была малая свяцёлка. Пры двары былі два хлявы, гумно, лазня. Былі пералічаны ежа і рухомыя рэчы: грэчка, сала, каса, сякера, жупан і інш. Удава прызнала пазыка Войцеха. З гэтага апісання нельга казаць пра заможнасць памерлага. Невялікая гаспадарка, са звычайным наборам рэчаў, але прадстаўляе сабой цікавасць як крыніца па штодзённаму жыццю мяшчан.

З сыноў Войцеха фігуруюць у дакументах толькі Марцін і Юзаф. Адам на 1644 г. прапаў без вестак [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 273адв. – 275адв.].

Марцін быў жанаты з Аленай Маркоўнай. Ён быў краўцом. У 1639 г. Марцін абвінавачваўся цэхмістрам Ослінскім у непадпарадкаванні цэху, не аднаразова

[1] У гэтых дакументах сустракаецца яшчэ варыянт прозвішча Хрыбуцэвіч.

выклікаўся ў суд, але не з'яўляўся. Цэхмійстр патрабаваў, каб ён вярнуў цэху грошы. Дакладна справа не апісана. Адзначалася, што Марцін рабіў мундзіры для войска караля Уладзіслава Вазы і для пяхоты Мееroні, для Конана шыў сукню на капліцу. Верагодна, ён выканаў замовы для кліентаў і не заплаціў у цэх складкі. Яго адвакатам быў лаўнік Даніэль Кішмановіч. 2 мая 1642 г. прысутнічаў ад імя краўцоў, цесляроў і маляроў [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 18, 19адв., 38адв.–39, 75–76адв.].

У 1640 г. Марцін набыў за 100 злотых у брата Юзафа трацiну спадчыннай валокі. Яна знаходзілася ў Адамавічах, межавала з аднаго боку з уладаннем удавы Яна Стрэчэня, а з другой – з уладаннем брата Марціна. На тэрыторыі знаходзіліся дворныя пабудовы, гумно, абора, засценак, сады, агароды, лясы і гаі. Юзаф прадаў маёмасць, бо не мог з-за сваіх заняткаў займацца гаспадаркай. У 1641 г. Андрэй Адамовіч і Марына Заліпшчанка прадалі Марціну Адамовічу і Алене Маркоўне за 100 коп літоўскіх грошаў валоку і чвэрць ворнай зямлі з пабудовамі ў Адамовічах. Знаходзілася яна каля ўладанняў Марціна Адамовіча і Войцеха Хрыбуценяці [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 134адв.–136, 188адв.–190].

На 1644 г. у валоданні Марціна знаходзілася спадчына па бацьках, у тым ліку частка брата Адама, які прапаў без вестак. Гэту маёмасць і набытую ў Андрэя Адамовіча ён прадаў Конану Сямёнавічу і яго жонцы Зяновіі Жукевічаўне, з умовай выплаціць 82 злотых малодшаму брату, калі той з'явіцца. У тым жа 1644 г. Марцін разам з жонкай набыў за 50 коп літоўскіх грошаў незасеяны пляц у гарадзенскага лентвойта Андрэя Каспровіча і яго жонкі Альжбеты Маргевічоўны. Каспровіч атрымаў гэту палову валокі па бацьку лаўніку Касперу Шчасновічу. Яна знаходзілася ў вёсцы Манчын, межавала з аднаго боку з уладаннем ксяндза і мансёнара гарадзенскага Фарнага касцёла Тамаша Неапаліты, а з другога – з уладаннем Марціна Хайноўскага [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 273адв.–275адв., 277–278]. У мяшчанскім асяроддзі маёмасць перапрадавалася часта. Нярэдкія выпадкі продажу спадчынных уладанняў.

Лёс дачок Войцеха склаўся наступным чынам. Люцыя была замужам за злотнікам Лукашам Скрабяскевічам. Згодна з тэстаментам маці Барбары Талочкаўны яна атрымала сваю частку маёмасці ад брата Марціна. Люцыя разам з мужам гэта прызнала ў магістраце ў 1638 г. У гэтым жа годзе Лукаш Скрабяскевіч падаў скаргу на брата жонкі Марціна аб нанясенні шкодаў на яго палях. У выніку было заключана пагадненне паміж імі [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 97адв., 102].

Альжбета разам з мужам Тамашам Дмухоўскім купіла за 50 коп літоўскіх грошаў у Яна Янавіча Печака зямлю ў Манчыне, якую ён атрымаў па бацьку Яну Печаку. Зямля межавала з уладаннямі паноў Кульбацкіх, сужэнцаў Фёдара Юрэвіча і Ганны Талочкаўны (1638). Тамаш Дмухоўскі фігураваў у скарзе. Супраць яго выказваліся цэхмістры і таварышы слесарскага, кавальскага, катлярскага, мечнікаўскага і нажаўнічага рамясла (1639) [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 22–23, 105–106].

Магчыма, Ева была яшчэ адной дачкой Войцеха. Яе мужам быў Андрэй Іванішэвіч. У інвентары спісання маёмасці па В. Адамовічу згадваецца Андрэй Рыбак, як і іншыя два зяці без прозвішча. Фёдар Каледзіня і Ганна Занкоўна прадалі Андрэю Іванішэвічу і Еве Адамовічоўне за 12 коп літоўскіх грошаў палову незабудаванага пляца, які перайшоў па спадчыне Ганне ад бацькі Міхала Занкевіча і маці Аксінні Сушчоўны. Пляц межаваў з аднаго боку з пляцам мечніка ВКЛ Халецкага, з другога – з вулачкай да Нёмана, насупраць двара Кубалі, чолам – да Нёмана, тылам – да другой паловы пляца (1642) [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 211–212].

Такім чынам, дзякуючы інвентару маёмасці і дакументам куплі-продажу атрымалася аднавіць склад сям'і Войцеха Адамовіча. Але для поўнай рэканструкцыі сям'і і сямейных адносінаў не хапае тэстамента Войцеха і яго жонак.

***Лінія Яна Адамовіча.*** Па дакументах атрымалася прасачыць лінію па бурмістру Яну Адамовічу (?–1666), але не было магчымасці выявіць яго сям'ю па паходжанню. Сыходзячы з кар'еры і шлюбу найбольш верагодна, што яго бацька быўураднікаў. Ян згадваецца на пасадах: лаўніка (1638–1643), радцы (1645–1647, 1654) і бурмістра (1644, 1650, 1652, 1653, 1657–1659) [6; 4, НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 3; КМФ-18, спр. 119, арк. 710адв.–712; КМФ-18, спр. 124, арк. 185адв.–186; КМФ-18, спр. 127, арк. 119, 142; 7, с. 114–115; 8; 9, s. 229]. Пачынаў кар'еру яшчэ да вайны 1654–1667 гг. Меў на захаванні кнігі па гарадскіх прыходах і расходах за перыяд яго бурмістраўства, а таксама ўласныя дакументы на фальварак пад мястэчкам Ліпск. На судзе Я. Адамовіч сведчыў, што пры другой маскоўскай інтэрвенцыі войскі забралі ў яго гэтыя дакументы (1659) [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25].

Ян Адамовіч быў жанаты з Агнешкай Весянеўскай, дачкой радцы Войцеха Весянеўскага. У шлюбе нарадзіліся Тамаш, Станіслаў, Стэфан, Агата, Зафея, Ганна, Ядвіга, Клара, Дарота. Вайна падарвала эканамічны стан сям'і. Я. Адамовіч і жонка А. Весянеўская па прычыне ўзросту і недахопу грошаў прадалі пусты пляц злотніку Готфрыду Варлангу і яго жонцы Кацярыне Дорбахаўне ў 1663 г. Маёмасць знаходзілася на Рынку, межавала з аднаго боку з уладаннем старога бурмістра Яна Яварoўскага, з другога – з уладаннем ад паноў Масніцкіх, чолам выходзіла на Рынак, а тылам – да пляца і камяніцы Шафароўчызна гарадзенскага жыда Сломы. На Адамовіча склалі пратэстацыю Ян Руткоўскі і яго жонка Дарота Плонская. Ён забраў піўны кацёл і не хацеў яго аддаваць (1662) [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 56адв., 77–78, 125–126].

Свой тэстамент бурмістр склаў практычна перад смерцю – 2 мая 1666 г., актыкаваны быў 14 мая 1666 г. [дадатак 2]. На гэты момант Адамовіч быў хворы. Была выказана просьба пахаваць у Фарным касцёле, у брацкім склепе Св. Тройцы. Усе валокі ў вёсцы

Адамавічы былі падораны жонцы за каханне ў шлюбе. Паміж дзецьмі маёмасць была падзелена наступным чынам: па палове валокі Агаце, Дароце, Стэфану, Станіславу. Старэйшы сын Тамаш яшчэ раней атрымаў палову пустой валокі і валоку з прыналежнасцямі. Зафея была выдадзена замуж за Мікалая Эйсмонта і цалкам усё атрымала. Кацярыне перайшла палова валокі, калі яна ішла замуж за Яна Трахімовіча. Па тэстаменце ёй прызначалася яшчэ палова валокі і свойская жывёла. Набытая ў Шараўскага валока дзялілася паміж Ядвігай і Ганнай. Дачка Клара была ўзята на выхаванне шваграм Бернатам Весянеўскім, і ён абяцаў яе выдаць замуж і даць пасаг. Пляменніку жонкі Вацлаву Самошы прызначалася яго ж 300 злотых, з якіх было аддадзена 150. Ён быў на выхаванні, і яго рэчы забралі маскоўскія войскі падчас акупацыі. Загадвалася выплаціць пазыкі чэлядзі. Уся рухомая маёмасць (пчолы, свойская жывёла і інш.) пераходзіла жонцы з умовай выплаціць пазыкі. Адамовіч адзначаў, што на патрэбы горада браў пазыкі ў Гануса Паўльсена, лаўніка Марціна Шаматулы, лаўніка Ф. Бабрыкевіча, Андрэя Рымучэвіча, а салянку аўса – у Сымона Шаматулы, каб паехаць у Варшаву для гарадскіх спраў. Адпаведна, была выказана просьба да гарадскіх уладаў кампенсаваць выдаткі. Апекунамі прызначаліся Бернарт Весянеўскі, Ганус Паўльсен, бурмістр Канстанты Дзіва [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 125–126].

Пасля смерці Адамовіча яго справы завяршалі жонка і нашчадкі. Бурмістр не зрабіў справаздачу за перыяд свайго кіравання ў 1661 г. Спадчыннікі разлічыліся толькі ў 1667 г. Перад магістратам справаздачыліся жонка Агнешка Весянеўская і сын Тамаш, лаўнік. Сваіх грошаў Адамовіч выдаткаваў для горада 439 злотых і 23 грошаў. Дадаткова пазычыў у Паўлесена 641 злотых і 12 грошаў, што было пацверджана тэстаментам і запісам у рэестры. Жонка і сын былі гатовы гэта пацвердзіць прысягай. Супраць гэтага выступілі сендыкі Готфрыд Варланг і Юзаф Адамовіч. Яны адзначылі, што фінансавую рэвізію Адамовіч не правёў пры сваім жыцці, а таксама не склаў адпаведныя дакументы з подпісамі радцаў. Таму прыведзеную інфармацыю не магчыма даказаць. У тэстаменце не была запісана сума выдаткаў на горад 439 злотых і 23 грошаў. Гэта стала прычынай не кампенсаваць грошы Адамовічам. Прынята была толькі пазыка Паўльсену, 641 злотых і 12 грошаў яна была запісана ў тэстаменце і на рэестры. Было прынята рашэнне выканаць прысягу жонцы і сыну, што бурмістр выдаткаваў грошы для горада. Пасля гэтага горад абавязаўся ўсё выплаціць [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 151адв.–152].

Была яшчэ адна справа, дзе фігураваў Я. Адамовіч. У 1665 г. каралявецкія купцы Крыштаф Фонмелін і Струзборк працягнулі перадваенную справу з гарадзенскім магістратам аб забранні ў іх 51 бочкі солі ў 1653 г. У сваім тэстаменце Адамовіч сцвярджаў, што не браў солі. Але ўказаў на Пятра Ляўковіча, які трымаў соль пад ключом і прадаваў. Перад магістратам сын Тамаш Адамовіч хацеў аддаць соль, але купцы не з'явіліся на пасяджэнне суда. Ён правёў следства 28 мая 1666 г. Выявілася, што для сябе забралі сольураднікі: бурмістр 1653 г. Ян Адамовіч 8 бочак, бурмістр 1653 г. Ян Явароўскі – 6, Станіслаў Цвікліч – 6, Мацей Яблаоўскі – 4, Фольтын Шульц – 2, Войцех Пятроўскі – 6, Ян Цвікліч – 2, Павел Кроснеўскі – 1, Тамаш Лагоўскі – 2, Мікалай Кудаеўскі – 2, жонка Пятра Ляўковічава – 3. Рэшту бочак бурмістр і радцы наклалі на горад. Справа скончылася прысудам на карысць купцоў у 1673 г. [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 112–112адв., 128–128адв., 268].

У 1674 г. Вацлаў Самоша падаў скаргу на радцу Тамаша Адамовіча і яго братоў Стэфана і Станіслава як нашчадкаў бурмістра Яна Адамовіча і Агнешкі Весянеўскай. Іх бацькі ўзялі яго ў апеку па смерці бурмістра Міхаіла Самошы і Цыцыліі Весянеўскай, а таксама і маёмасць (золата, серабро, хатнія рэчы, аптэка). На момант падачы скаргі Вацлаў быў паўналетнім і патрабаваў вяртанне спадчыны. Нашчадкі Адамовіча не аддавалі рэчы, камянічку і аптэку [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 366]. Рашэнне па справе не выяўлена. Але тут відавочнае парушэнне закона. Такія выпадкі не адзінкавыя ў тыя часы. Апекуны карысталіся маёмасцю непаўналетніх і не спяшаліся вяртаць. Як правіла, суды прымалі бок скаржніка.

Далейшы лёс дзяцей Яна Адамовіча склаўся наступным чынам. Кацярына сваю палову валокі ў сяле Адамавічы прадала разам з мужам, ліпскім лаўнікам Я. Трахімовічам радзецкаму пісару Казіміру Мікалаевічу і яго жонцы Марыяне Скуліноўскай за 70 злотых. Яна знаходзілася з аднаго боку ад уладання роднай сястры Ядвігі Адамовічаўны, з другога – ад уладання нябожчыка Міхаіла Шэльпука, канцом – да в. Баранавічы, другім канцом – да в. Міткевічы. Прадалі (1669) [4, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 187–188адв., 190].

Старэйшы сын Тамаш займаў пасады радзецкага пісара (1663–1670), лаўніка (1667–1671), радцы (1672–1676). У магістрацкай кнізе ён часта фігураваў пры выкананні сваіх абавязкаў: праз яго падавалі скаргі, прадстаўляліся інтарэсы мяшчан у судзе, як лаўнік і радца прысутнічаў на пасяджэннях магістрата, праводзіў расследаванне справы мяшчанкі Раіны, дачкі гарадзенскага ката Марціна Загурскага, якая здраджвала мужу з жыдам, гарадзенскім рэзнікам Шымкам Хаімовічам [4, ф. 1800, спр. 1, арк. 102адв.–103адв., 117–118, 164адв.–165, 201адв.–202адв., 226адв.–227адв., 246–246адв. і інш.].

Тамаш Адамовіч быў жанаты з Ганнай Рошчыцаўнай. Сужэнцам аддалі ў заставу землі ў Адамавічах гарадзенскаму лаўніку Матэушу Масніцкаму і яго жонцы Кацярыне Эйсімантаўне за 30 злотых (1676), пасля за 40 злотых (1678) [10].

У 1674 г. былі ўзаемныя скаргі, але без прысуду, з аднаго боку, ад паручніка Яго Каралеўскай Міласці Адама Мыцкага і яго жонкі і з другога – ад радцы Тамаш Адамовіч і яго жонкі Ганна. У скарзе Мыцкага справа была пададзена так. Калі Мыцкі ажаніўся з бурмістраўнай Магдаленай Цвіклянкай, якая першы раз была

за Юрыем Стрэчаням, другі – за Цібароўскім, ёй шкодзілі: калі яна была ўдавой, Адамовічы абражалі, прыніжалі яе гонар. Калі ён быў з дачкой на палі 2 кастрычніка, Адамовіч казаў рэчы, якія шкодныя для захавання шлюбу. Што быццам бы дачку яна не нарадзіла, а купіла, прывезлі ад татарына. 2 кастрычніка Магдалена нарадзіла сына, а яны сталі казаць, што не сама, а жанчына з вёскі прынесла, а сваё пахавалі, бо памерла. Пазней у Гародні на кірмашы Адамовіч напіўся і казаў публічна свайму брату Стэфану, што сваячка неўчцівага ложа, сама непрыстойная. 12 кастрычніка 1674 г. Т. Адамовіч падаў скаргу з-за збіцця. Мыцкі на яго гвалтоўна напаў. Была пададзена адпаведная рэляцыя лаўніка [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 382–382адв., 384].

Сын Стэфан таксама займаў пасады ў гарадзенскім магістраце. Ён быў радцам (1689) і бурмістрам (1691) [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 3, арк. 49адв.]. Яго жонка Кацярына ахвяравала на алтар Анёла Ахоўніка ў Фарным касцёле пярсцёнак (1688) [11, арк. 24адв.].

С. Адамовіч фігураваў у скаргах. Шляхціч Аляксандр Казімір з Ялава Барановіч падаў скаргу на Стэфана Адамовіча і радцу Сымона Шаматулу. 2 сакавіка 1676 г. яны здзейснілі напад на Шчыгельскага. Барановіч стаў іх супакойваць, прасіў не біць. Збіццё перакінулася на Барановіча. Адамовіч стаў біць яго шабляй. Шляхціцу вырвалі валасы, моцна збілі нагамі. У той жа дзень была пададзена скарга і лентвойт Лявон Эйсімант адправіў урадніка агледзіць збітага Аляксандра Барановіча. Лаўнік Міхаіл Барысовіч сведчыў, што пацярпелы моцна збіты, галава паранена, у дадатак грошы забралі [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 418, 419]. Выраку па справе ў кнізе не выяўлена. У 1691 г. Уладзіслаў Дорбах абвінавачваў лентвойта Яна Шульца і бурмістра і Стэфана Адамовіча ў намове нейкага гультая, каб ён яго збіў [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 3, арк. 97]. Вынік справы не выяўлены.

Далейшы лёс дзяцей Я. Адамовіча прасачыць не атрымалася па прычыне адсутнасці належных дакументаў. Прыведзеныя факты дазваляюць казаць, што Ян атрымаў адпаведную адукацыю, каб працаваць у магістраце. Адпаведна, яго сыны мелі магчымасць зрабіць кар'еру ў гарадзенскім магістраце.

**Заключэнне.** Такім чынам, гісторыя сямей Войцеха і Яна Адамовічаў прадстаўляе цікавы фрагмент з жыцця мяшчан. Маёмасны стан і сацыяльны статус яго прадстаўнікоў дазваляў мець шлюбныя адносіны з асобамі з дробнай шляхты і з дзецьмі ўраднікаў, займаць пасады ў магістраце. Выпадак бурмістра Яна Адамовіча паказвае, што справаздачу ўраднікі не рабілі своечасова і гэта абавязак пераходзіў на сваякоў. Яго дзеці пайшлі па яго слядах. Аднак свае абавязкі як ураднікі выконвалі па-рознаму, нават з парушэннямі. З прыватна-прававых дакументаў атрымліваем інфармацыю аб маёмасным стане сям'і, аперацыі па куплі-продажы і падзеле маёмасці. У выніку дакументы даюць уяўленне пра грамадскае і прыватнае жыццё прадстаўнікоў роду Адамовічаў.

**Дадаткі**

Дакументы друкуюцца на мове арыгіналу. Напісаны на польскай мове XVII ст. Скароты раскрыты. Захоўваюцца дакументы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.

***Дадатак 1. Інвентар падзелу маёмасці па Войцеху Адамовічу***

Друкуецца на падставе: НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 102адв.–103.

[102адв.] Inwentarz dobr oyczystych po nieboszczyku P. Woyciechu Adamowiczu pozostałych prosząc aby do xsięg przyięty y wpisany ktory po jawnym przeczytaniu od słowa do słowa tak sie w sobie ma. Roku Panskie(g) o 1638 dnia 31 m(ie)s(ią)ca maia Jan Adamowicz ławnik grodz(ienski) oznaimuię iz ia będąc przydany od szlachetne(g)o P. Stanisława Cwiklicza lantwoita grodz(ienskiego) za ządaniem P. Marcina Adamowicza y uczciwey P. Anny Kotowiczowny Woyciechowey Adamowiczowey pozostałey małzonki do domu we wsi Adamowiczach nieboszczyka P. Woyciecha Adamowicza dla spisowania y zrewidowania rzeczy pozostałych nieboszczykowskich gdzie ia sprawuiąc sie wedla powinnosci urzędu swego przy bytnosci obudwu stron tak P. Marcina Adamowicza iako y małzonki nieboszczyka P. Woyciecha Adamowicza za ządaniem tak y pozwoleniem obudwu stron y pokazowaniem rzeczy tak in regestrz y inwentarz przy bytnosci inszych ludzi spisał y uczynił. Naprzod bydynek izba czarna z sienią przez nią swietełka mała takze gumno ze wszytkim pokrywem, łaznia w ktorey w sieniach iest oznica do ktorey oznicy odzywał sie zięc nieboszczykowski P Jan Malarz mienił iz ią kupił u nieboszczyka. Do tego chlewow 2, podle wrot swirenek z zamkiem wniętrznym, w ktorym swirenku nalazłem zyta z plewami s puł czeczki, słoniny połec tak nie wielki, sadła połowica, gryki trzeciak, przenice czwertka, jaczmienia puł trzeciaka, siekierz 3, barta 1, kosa 1, dłot 4, swider jeden wielki a mnieysze 2, z nowu drugie 2 jeszcze mnieysze, noznicy owcze 2, hebel 1 mały, drugi wiekszy, rozenek 1 niewielki, siekierka mała. Noz ostry jeden, sierzpow 3, siekacz 1, lin 2 jedna wozowa druga do wlow ciągnienia, oszczep 1, ciosła 1, skobel 1, ubranie zielonie stare, zupan biały prosty, kopieniak biały, zasiewka włoka z puł zasiana mienili byc z P. Janczewskim, na ktorey włoce posiał nieboszczyk trzeciakow zyta 3 jakoby zięciowi swemu Łukaszowi złotnikowi przypominał sie zeby mu wolno było poząc zasiewek. Jarzyny, grochu szanek mieniła byc posiany z puł z P. Marcinem Fandeberkiem. Pszenice puł szanka z puł ze mną Janem Adamowiczem. Jęczmiena 1 beczka własna, jarke trzeciak, owsa szankow 2 to iego własnie, pszczoł ulow 9, z ktorych pszczoł1 mienił sobie P. Fiodor Jurewicz s puł z nieboszczykiem, drugi iakoby iego własny, trzeci ul wierzbowy mienił sobie bydz darowany P. Łukasz złotnik zięc iego a drugie ulego własne nieboszczykowskie pustych ulow bez pszczoł 8, dziewiąty nowy teraz wyrobiony. Strony długow nieboszczykowskich tam za przypominał sie czeladnik ktory służyłł [103] u nieboszczyka na imie Andzrey

ktury dług y sama przyznał P. Woyciechowa iz został nieboszczyk winien kop 3 litt tam ze niewiasta co słuzy myto tak rocznie nie płacone kopa 1 litt Charytonowi z Bohatyrom zyta beczka Kononowi. Co wszytko sama przyznała. Co sie tknie bydła wołow 2, krowa jedna, cielat tegorocznych 2, owiec starych 5, młodych 4, kon 1 szersci myszatey, swini 2. To sie stało przy bytnosci ludu uczciwego P. Fiodora Jurewicza ławnika grodz(ienskiego), P. Jana Malarza, P. Łukasza Złotnika, P. Andrzeja Rybaka zięcow nieboszczykowskich, P. Jana Mikołaiewicza y P. Michała Szedpucha, P. Kazimierza Adamowicza. Co tak iest a nie inaczey na co daię tę relatyą z podpisem ręki moiey włąsney do ktorey moiey relatyey za ządaniem stron ktorzy pisac umieli ludzie przy mnie będący ręce swe podpisali. Działo sie w Adamowiczach. Roku y dnia wysz pomienego u niego podpisy ręk w te słowa Jan Adamowicz ławnik grodz(ienski), Jan Czechowicz ręką swą, Łukasz Skorbiakiewicz ręką swą iakosmy tego byli wiadomi. Ktory inwentarz z oblatą pisarską oddanych iest temu P. Marcinowi Adamowiczowi. Za czem podług compromissu stalego miedzy P. Marcinem Adamowiczem a P. Łukaszem Skorbiakiewiczem y małzonką iego Łucią Adamowiczowną iz braci P. Jozepha y Adama Adamowiczow do działu oyczystych dobr nie masz za ządaniem onych potym to PP. Adamowiczow z sądu list wydany iest a zeby do działu dobr oyczystych przybyli miedzy rokiem y szeszią niedziel gdyz iesliby na ten czas nie przybyli urząd do działu y sądu będzie moc miałł przystąpic. Co iest za pamiętnego obłozeniem zapisano y wypisem stron wydano.

***Дадатак 2. Тэстамент бурмістра Яна Адамовіча***

Друкуецца на падставе: НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 125–126.

Działo się w domu sądowym in presentia szł(ache)tnych PP Hanusa Paulsena burms(trza) y lantwoyta, Constantego Dziwa burmistrza, Jana y Adama Cwikliczow, Jakuba Szamatuły, Jana Zielepuhy, Jakuba Szarawskiego radziec, Adama Iwaniszewskiego Symona Szamotuły, Thomasza Adamowicza ławnikow, dnia czternastego may roku 1666.

Testament P. Jana Adamowicza.

Przed kturym urzędem powstawszy z mieysc swoich Sł(ache)tni PP. Adam Iwaniszewski y Symon Szamotyła Sapinski ławnicy testament zeszłego Sł(awe)tnego Pana Jana Adamowicza burmistrza starego grodzienskiego na ktury za cedulą z urzędu byli przydani do akt podali tewom takowego roku 1666 dnia 2 msca maia przede mna Adamem Iwaniszewskim y Symonem Szamotułą Sapinskim ławnikami grodzienskimi za przydaniem Sł(awe)tnego Pana Hanusa Paulsena łentwoyta grodzienskiego na ządanie Sł(awe)tnego P. Jana Adamowicza burm(istrza) starego y raycy grodzienskiego na przesłuchaie ostatniey woli iego takowym sposobem przy zupełnym rozumie lubo na ciele chorobą od Pana Naywyszszego nawiedzony wszelakich dobr ruchomych y lezączych, ciezarow długow uczynił ostatnią dispositią.

W Imie Oyca y Syna y Duche Swia(tego). Amen. Ja Jan Adamowicz czynie wiadomo tym moim pismem ostatniey woli moiey dispositią iz ia acz będąc na ciele chorobą nawiedziony od P. Boga, ale na rozumie zdrowy y widząc to iz na smierc nie ma nic pewnieyszego. Naprzod tedy duszę moią Panu Bogu w ręce poruczaiąc. Grzeszne ciało moie małzonki moiey y dziatek moich proszę aby według powinnosci chrescianskiey w kosciele Farskim grodzienskim w sklepie brackim Troyce Przenaswiętszey pogrzebli. Na ktory pogrzeb co nalezy podług obrzedow chresianskich z dobr moich expendowac małzonka moia z dziatkami memi powinna [125адв.] będzie. Dobra moie lezące iako to włoki oyczyste y zakupne we wsi mieyskiey grodzienskiey Adamowiczach z ktorych gruntow wprzed za wszelakie mnie przez wiek moy doznaną małzenska zyczliwosc y poszanowanie miley małzoncie moiey Jagnieszce Wiesieniewskiey Adamowiczowey do dospositiy y dobro według uzywania pachania od włoki zakupney Szarawskiey włok oyczystych leguię daruię realna dispositią do tego gruntu komu chcąc dac, darowac, przedac, zapisac. Od tych pułtory włok pułwłok naymnieyszey corce moiey Agacie pułwłoki. Za tym pułwłokiem synowi Stephanowi pułwłok. Za tym pułwłokiem znowu przy wiedzi P. Symona Sapinskiego Szamatuły ławnika grodzienskiego pułwłoki synowi memu Stanisławowi. Synowi zas starszemu memu Thomaszowi iakom za zywota mego oddał onemu przed tym pułwłoki w sadzibie gołe niezabudowanie, a we dwuch poletkach włoke cale ze wszystkiemi przynaleznosciami miedzy gruntem zastawnym PP Massnickich y teraz bez zadnego zatrudnienia ma przy tym zostawac gruncie y onemu ten grunt oddaie y zapisuię. Corce moiey Zophiey kturom wydał w stan S(więty). małzenski za P. Mikołaia Eysmonta tey się we wszystkie dosic stało nie mam zadną rzecz bracią y siostr swoich turbowac. Corce moiey Katharzynie kturą takze w stan S(więty). małzenski wydałęm za P. Jana Trochymowicza tey jakom dał pułwłoki gruntu oromego obmiedze Jerzego Szelpuka y brata iego Piotra y teraz tez pułwłoki oney leguię wyprawę y bydło podług przemnozenia wzieła. Corce mey Jadwidze pułwłoki gruntu tey włoki com kupił od P. Jakuba Szarawskiego leguię, a drugie pułwłoki tegoz gruntu mego drugiey corce mey Annie. Corke moią Clare ktorą na promisią swoie Jm P. Bernat Wiesieniewski szwagier moy miły wział y iako dziecie swoie wychowawszy z łaski swey w stan S(więty). małzenski albo iaka wola Boza będzie oddac przyobiecał z wyprawą dosic się stało y posagu nic wydano z dobr oyczystych na kture wykupuiąc y macierzyste przedani. Dorocie corce moiey pułwłoki gruntu od tey włoki com kupił od P. Szarawskiego leguię strony Wacława Tamosza[2] .Małzonki mey siestrzanka ktorego w opiecie moiey miał ruchomosc wszelaką wszystką nieprzy(acie)łł moskal zabrał. A com odyskał od Jm P. Starosty Grodzienskiego złł trzysta iemu nalezące wydałem zł pultrzecia sta na mieysckie potrzeby na co są y regestra ktore odysławszy małzonka moia z dziatkami onemu maią oddac. A złotych 50 małzonka moia z dobr tych ktorem oney opisał ma oddac.

[2] У іншым дакуменце напісана прозвішча Samosz [4, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 366].

Insze summy ktore odyskał po nieboszczyku P. Stanisławie Cwikliczu burm(istrzu) grodzienskim wydałem na prawo dochodząc smierci oyca iego insze drobiazge wszystkie powstale Moskwa zabrała. Kamieniczka, plac, apteka, ogrod te wolne strony. Soli ktorą za burmistrowstwa mego z P. Jaworowskim za wolą radą y wiadomoscią panow radzice kupcow krolewieckim y wicin zabrani iako wiele pamiętam dałem regestr a iakom tey soli z wicin nie brał ale P. Piotrowski brał będą deputowany od panow radziec lepey moze wiedziec wiam się oney nie tykał okrom com w regestrze y te z rąk Pana Lewkowicza wziałem ktory przedawał y za kluczem swoim miał te sol a nie tylko w roku moim przedał ale w roku następuiącym P. Stanisława Cwiklicza y P. Jabłownoskiego komu pieniądze oddał nie wiem a insze onych tykał ani do siebie odbierał y do mnie nie oddawał P. Lewkowicz. Strony P. Kazimierza Cwiklicza raycy grodzienskiego ktory iakom słyszał od ludzi [126] ze sie iakiey nalezytosci za grunt upomina ktury kupił u nieboszczyka oyca iego P. Stanisława Cwiklicza za co nie winno wypłacone wszystko oycowi iego y dał oyciec iego kwitacyą ktorą Moskwa zabrała a niewinne nieboszczyk P. Stanisław odebrawszy summę zupełną zatrzymał. Strony Sł(awe)tnego Pana Hanusa Paulsena burm(istrza) grodzienskiego u ktorego na pilne mieyskie potrzeby moy oblig własny y osobliwie na regestra ręką moią podpisane tak pieniędzmi iako y legatami nabrał pokornie proszę aby z miasta w się pokaze było wypłacono. Strony Marcina Szamatuły ławnika grodzienskiego u ktorego takoz wziałem na mieyskie potrzeby będąc burm(istrzem), temu takoz pokornie proszę co się pokaze nie wypłacono aby z miasta było oddani. A co dał zł 15 P. Pawłowi Worobieiowi tych ze pieniędzy o czym me P. Marcin tegom nie odyskał y oblig zginałł wolno odyskac z dobr P. Worobieiowych. Strony P. Theodora Bobrykiewicza ławnika grodzienskiego u ktorego takoz brał na mieyskie potrzeby, ale trymał arende za to y rachunku nie uczynił. Iesliby tedy co winni pokazało się proszę aby z miasta było wypłacono. Strony Andzieia Rymuczewicza u ktorego takoz na mieyskie potrzeby brałem będąc burm(istrzem) ten darował dobrowolnie. Dług swoy za szafarstwo publice y nie ma więcey upominac. Strony długa Jm P. Grotkowskiemu iako to zyto ktore za moią paręką Oporowskie wziął zem tego zyta zadney a ni naymnieyszey części na siebie nie obrocił a ni uczywał iako się sam Oporowski przed Imscią przyznał y obiecał cale oddac. O co małzonka moia y dziatki turbowani byc nie maią ani tego zyta oddawac tylko O. Oporowski. Strony Rudego u ktorego oblig zostaie nie winne oddano wszystko y nic nie winno darmo oblig za codziennemi turbaciami zatrzymany. Strony Jm P. Studzienskiego urzednika Wielm Jey Msci Pani Wołowiczowey podskarbiney WXL y tam oblig nie winne zatrzymany oddano wszystko y sto dziatki moie y małzonka moia turbowani byc nie maią. Strony Jm P. Stanisława Sopocka y tam oblig zatrzymany tylko za ktury y za to wszystko oddani u Marcina Kulincza u ktorego plac za Niemniem w zastawie wstaie za oddaniem summy podług listu danego wolno dziatkom okupic. Inne długi iako to P. Iwaniszewskimu za klacz ktorą zołnierze za całą wies wzieli. Długi winne czeladzi y mne ktore by się pokazały z dobr moich wypłaconie byc maią. Ruchomosc wszelaka, pszczołu, bydło, owcy, swinie przy dispositiy małzonki moiey zostawac ma na zniesienia długow. Owsa solanke ktora wsziął y P. Symona Szamatuły na potrzeby mieskiey do Warszawy. Iesliby z miesta nie oddano to z dobr moich ma byc oddana. Takową tedy ostatnią dobrowolną wszelakich dobr moich uczyniwszy przy dobrey pamięci dispositia pokornie upraszam aby chcieli podług zyczliwosci swey ktorą mi zawsze swiadczali za zywota y po smierci mey aby małzonki moiey osierosiałey y dziatek moich chcieli byc opiekunami y obroncami Jm P. Bernata Wiesieniewskiego iako miełego szwagra mego, Sł(awe)tnych PP. Hanusa Paulsena, Constantego Dziwa burmistrow tegorocznych o co y powtore upraszam aby poniąc na ukrzyzowanego Pana onym radą y pomocą chciali byc. Do ktorey woli moiey ostatniey y pisma mego przy podpisie panow ławnikow przydanych ręka moią własną podpisałem. U tego testamentu podpis ręk temi słowy. Pan Jan Adamowicz rayca g(ro)dz(ien)ski ręką swą własną, Adam Iwaniszewski ław(nik) g(ro)dz(ien)ski, Symon Szamatuła Sapinski ław(nik) g(ro)dz(ien)ski. Ktory ten testament iest do ksiąg woytowskich grodzienskich zapisany.

### Літаратура


1. Сліж, Н. Купцы Фандэберкі ў Гародні ў XVII ст. / Н. Сліж // Архіварыус. – 2016. – Вып. 14. – С. 347–357.
2. Сліж, Н. Мяшчанскі род Кудаеўскіх у сістэме кіравання Гародні / Н. Сліж // Учёные записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова»: сб. науч. тр. – 2020. – Т. 32. – С. 74–80.
3. Писцовая книга Гродненской экономии. – Ч. 2. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1882. – 607 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1761. Воп. 1. Спр. 1, 2, 3; Ф. 1800. Воп. 1. Спр. 1; КМФ-18. Спр. 77, 86, 119, 124, 127.
5. Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas. – F. 1282. – Ap. 1. – B. 7021.
6. Брэгер, Г. Дэкрэт, які служыў жыдам гродзенскага кагалу / Г. Брэгер // Памяць. – Гродна, 1999. – С. 106–107.
7. Шаланда, А. Пергаміны канца XVI–XVII ст. на лацінскай і польскай мовах ў фондах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея / А. Шаланда // Герольд Litherland. – 2002. – № 3–4 (7–8). – С. 110–120.
8. Biblioteka Uniwersitetu Warszawskiego. Gabinet rękopisów. – Sygn. 260. – Dok. 72.
9. Metryka Litewska. Księga wpisów nr 131 / Oprac. A. Rachuba. – Warszawa, 2001. – 532 s.
10. Lietuvos mokslų akademijos centrenės bibliotekas Rankraščių skyrius. – F. 43–8170; F. 43–8171.
11. НГАБ у Гродне. – Ф. 259. Воп. 2. Спр. 2.


*Паступіў у рэдакцыю 23.11.2022*